DGAP

Deutsche Gesellschaft
für Auswärtige Politik e.V.

**Конкурсны набор 2016/2017
каледжа імя Карла Фрыдрыха Герделера «Эфектыўнае дзяржаўнае і грамадскае кіраванне» (Good Governance)
на ўдзел у адукацыйнай праграме фонду імя Роберта Боша у супрацоўніцтве з Нямецкім таварыствам знешняй палітыкі (DGAP)**

Берлін, снежань 2015

Паважанае спадарства!

Я хацеў бы звярнуць Вашу ўвагу на праграму каледжа імя Карла Фрыдрыха Гёрделера «Якасць дзяржаўнага і грамадскага кіравання» (Good Governance). Каледж займаецца павышэннем кваліфікацыі маладых кіруючых кадраў з Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Малдовы, Расіі, Турцыі і Украіны ў сферы якасці дзяржаўнага і грамадскага кіравання. Такім чынам, мэтай каледжу з'яўляецца імкненне да умацавання дзейнасці у грамадскім сектары (адміністрацыйнае кіраванне, грамадскія арганізацыі) і галіне эканомікі.

У якасці дырэктара каледжа на працягу некалькіх гадоў я суправаджаю гэтую праграму і звяртаюся да Вас з просьбай падтрымаць абвешчаны конкурсны набор удзельнікаў. Распаўсюдзьце, калі ласка, інфармацыю аб праграме сярод сваіх дзелавых калег, і прапануйце кваліфікаваным супрацоўнікам падаць заяўку на ўдзел у адукацыйнай праграме.

Праграма каледжа разлічана на кіруючыя кадры з шматгадовым вопытам прафесійнай дзейнасці ў сферы публічна-прававога ўпраўлення, у камерцыйных прадпрыемствах і грамадскіх арганізацыях. Перадумовай для ўдзелу ў конкурсе з'яўляюцца наяўнасць дыплома аб вышэйшай адукацыі, цікавасць да павышэння якасці дзяржаўнага і грамадскага кіравання і да палітычнага ладу мыслення, пачуццё адказнасці перад грамадствам і добрыя веды нямецкай мовы.

Выбраныя намі ўдзельнікі каледжа атрымаюць магчымасць:

- наладзіць карысныя сувязі з вядучымі экспертамі ў галіне грамадскай, палітычнай і адміністрацыйнай дзейнасці ў Германіі і ЕС;
- павысіць кваліфікацыю ў галіне якасці дзяржаўнага і грамадскага кіравання і атрымаць адпаведны сертыфікат аднаго з нямецкіх універсітэтаў;
- развіць кампетэнцыі кіраўніка і пашырыць веды па праектным менеджменце;
- пазнаёміцца бліжэй з установамі ў Германіі, якія дзейнічаюць прыкладна ў той жа галіне, што і ўстановы, у якіх працуюць канкурсанты ў сябе на радзіме;
- стаць часткай міжнароднай супольнасці маладых лідэраў у Еўропе.

Rauchstraße 17/18
10787 Berlin
Tel.: +49 (0)30 25 42 31-47
Fax: +49 (0)30 25 42 31-71
goerdeler-kolleg@dgap.org
www.dgap.org

DGAP

Акрамя таго, ўдзельнікі змогуць рэалізаваць у рамках праграмы каледжа свой уласны праект па павышэнні якасці кіравання ў сябе на радзіме.

Работадаўцы канкурсантаў не нясуць ніякіх выдаткаў у сувязі з удзелам іх супрацоўнікаў у праграме каледжа. Транспартныя выдаткі, выдаткі на атрыманне візы, пражыванне і большую частку выдаткаў на харчаванне, а таксама дадатковыя выдаткі, звязаныя з удзелам у семінарах, бярэ на сябе Фонд імя Роберта Боша.

Вы, як непасрэдны кіраўнік, маеце магчымасць падтрымаць Вашых супрацоўнікаў пры падачы заяўкі на ўдзел у праграме, напісаўшы адпаведны рэкамендацыйны ліст (падрабязную інфармацыю наконт дадзенага ліста канкурсанты могуць знайсці на інтэрнэт-сайце праграмы). У выпадку, калі Вашыя супрацоўнікі будуць адабраныя для ўдзелу ў праграме каледжа, мы просім Вас даць ім магчымасць прыняць удзел ва ўсіх мерапрыемствах каледжа на працягу года. Да такіх мерапрыемстваў належаць трохтыднёвы семінар у Германіі (з 27 жніўня па 16 верасня 2016 г.), пяцідзённы прамежкавы семінар у сакавіку 2017 г. і заключная трохдзённая сустрэча ў жніўні /верасні 2017 г. ў Берліне.

Дадатковую інфармацыю аб праграме Вы знойдзеце ў прыкладзеным флаеры на нямецкай мове і на сайце www.goerdeler-kolleg.de.

**Апошні тэрмін падачы заявак: 22 лютага 2016 г.**

З пытаннямі Вы можаце звярнуцца да кіраўніка праграмы спадарыні
**Леа Сафі Деварэцкі (DGAP):**
Пытанні па тэлефоне
(на нямецкай і англіскай мове): + 49 30 25 42 31 47.
Пісьмовыя звароты
(на нямецкай, англіскай і рускай мове): goerdeler-kolleg@dgap.org.

Загадзя дзякую за дапамогу.

З павагай,

праф. **Гюнтэр Фэрхойген**
Дырэктар каледжа
Экс-віцэ-прэзідэнт Еўрапейскай камісіі